ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Установа адукацыі
"БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА"
Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай філалогіі
праводзяць
Рэспубліканскі завочны навукова-практычны семінар

# «ТЭКСТ У ПАРАДЫГМЕ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ»

Семінар адбудзецца **16 сакавіка 2022 года** па адрасе: г. Брэст, вуліца Міцкевіча, 28.

**Праблемнае поле семінара:**

– тэкст у сістэме навучання мове і літаратуры ў ВНУ і школе;
– тэкстацэнтрычны падыход у выкладанні дысцыплін;
– філалагічны, лінгвістычны, літаратуразнаўчы і інш. аналізы тэксту;
– тэкст як адзінка камунікацыі;
– тэкставыя прыкметы і катэгорыі;
– тэкст і дыскурс;
– моўныя адзінкі ў тэксце;
– культуралагічны і выхаваўчы патэнцыял тэкстаў;
– творчыя працы як спосаб развіцця навыкаў камунікацыйнай і тэкстаўтваральнай дзейнасці.

**Форма ўдзелу ў семінары: завочная.**

Рабочыя мовы семінара – беларуская, руская і інш. славянскія мовы.

Для ўдзелу ў семінары **да 4 сакавіка 2022 года** неабходна даслаць у аргкамітэт заяўку (узор прыкладаецца) на адрас e-mail: bellingv@brsu.brest.by

Па заканчэнні семінара плануецца выданне зборніка навуковых артыкулаў. Пры выданні зборніка аргкамітэт пакідае за сабой права рэдагавання тэкстаў. (Магістранцкія/студэнцкія матэрыялы прымаюцца толькі ў суаўтарстве з навуковым кіраўніком.) Арганізацыйны ўнёсак на падрыхтоўку да друку і выданне зборніка – **20 беларускіх рублёў**. Рассылка папяровых экзэмпляраў зборнікаў па жаданні ўдзельнікаў семінара можа быць зроблена па пошце (з накладной платай).

## Патрабаванні да афармлення матэрыялаў

Аб'ём публікацыі – да 4 старонак камп'ютарнага набору, тэкставы рэдактар – MS Word, шрыфт Times New Roman, кегль 14, праз адзінарны інтэрвал, без знакаў пераносу, абзац – 1,25 см, палі: верхняе – 35 мм, астатнія – 25 мм. Старонкі не нумаруюцца. Спасылкі ў тэксце даюцца ў квадратных дужках. Першая лічба – нумар крыніцы ў спісе літаратуры, другая – нумар старонкі. Напрыклад: [2, с. 15]. Двукоссе ў тэксце парнае (для рускамоўнага тэксту – «…»; для беларускамоўнага тэксту – "…"). Ілюстрацыйны матэрыял выдзяляецца курсівам, пры неабходнасці асобныя элементы ілюстрацыі могуць быць выдзелены тлустым курсівам. Прыклады, набраныя курсівам, аддзяляюцца некурсіўнымі коскамі (*назоўнік*, *прыметнік*, *займеннік*).

На першай старонцы пасля абзацнага водступу злева ўказваюцца: тлустым шрыфтам – ініцыялы і прозвішча аўтара (аўтараў), наступны радок (без вылучэння тлустым шрыфтам) – горад і назва ўстановы адукацыі (ці іншай арганізацыі). Затым праз радок – назва матэрыялу вялікімі літарамі тлустым шрыфтам. Праз радок друкуецца матэрыял са стандартнымі адступленнямі. Спіс выкарыстанай літаратуры прыводзіцца ў канцы артыкула 12 кеглем. Крыніцы размяшчаюцца ў парадку іх ужывання ў тэксце і афармляюцца згодна з прынятым ДАСТ.

Афармленыя па патрабаваннях матэрыялы дасылаюцца ў электронным выглядзе да 16 сакавіка 2022 г. на адрас: bellingv@brsu.brest.by

Пералічэнне ўнёску ўдзельнікамі з іншых устаноў ажыццяўляецца да 16 сакавіка 2022 г. на разліковы рахунак з абавязковай паметай у графе “назначение платежа” – **семінар “Тэкст”. Указаць сваё прозвішча.**

Рэквізіты для аплаты:

| **Виды услуг** | |
|---|---|
| • **прочие услуги: семінар. Тэкст** | |
| **Реквизиты для оплаты:** | |
| *Наименование получателя:* | **БрГУ им. А.С. Пушкина** |
| *Расчетный счет:* | **BY02 AKBB 3632 9000 0167 3100 0000** |
| *УНП:* | **200050321** |
| *ОКПО:* | 02148014 |
| *БИК:* | AKBBBY2X |
| | ОАО «АСБ Беларусбанк» |

**Кантактныя тэлефоны:** (код г. Брэста – 8-016) 21-63-50 (кафедра беларускай філалогіі), 8-029-2269566 (МТС) (Яўдошына Ларыса Іванаўна), 8-029-7294384 (МТС) (Леванцэвіч Лена Васільеўна).

## ЗАЯЎКА
на ўдзел у Рэспубліканскім навукова-практычным семінары
«ТЭКСТ У ПАРАДЫГМЕ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ»

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку ___________________________________
2. Месца працы _______________________________________________
3. Пасада ___________________________________________________
4. Вучоная ступень, вучонае званне ______________________________
5. Кантактны тэл. (+ код) ______________________________________
6. E-mail____________________________________________________
7. Паштовы адрас_____________________________________________
8. Назва даклада ______________________________________________
9. Папяровы экзэмпляр зборніка (*выбраць патрэбнае*: атрымаю на кафедры, прашу выслаць па пошце з накладной платай) ____________

## Узор афармлення матэрыялаў:

**С. М. Кандраценя**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

**МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ ВУЧЭБНАГА ТЭКСТУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**

Тэкст……………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………………

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Гілевіч, Н. І. Таямніцы роднага слова: З назіранняў над мовай і стылем твораў беларускай мастацкай літаратуры / Н. І. Гілевіч. – Мінск : Про Хрысто, 2006. – 128 с.